В. П. Красней

# Беларуская мова ў табліцах і схемах

Для школьнікаў

*8-е выданне*

Мінск • «Аверсэв» • 2020

# Злучнік як часціна мовы

**Злучнік** — нязменная часціна мовы, якая звязвае аднародныя члены сказа, часткі складанага сказа і самастойныя сказы і паказвае на сэнсава-граматычныя адносіны паміж імі.

Гэтыя адносіны (спалучальныя, размеркавальныя, часавыя і г. д.) лічацца асноўным значэннем злучніка.

Злучнікі — нязменныя словы, яны не маюць лексічнага значэння і не з'яўляюцца членамі сказа

# Разрады злучнікаў

Разрады злучнікаў вылучаюцца з улікам іх паходжання, будовы (структуры), ужывання і функцыянальнага значэння.

**1. Паводле паходжання**

- **невытворныя:** не суадносяцца са словамі іншых часцін мовы: а, але, бо, ды, і, каб, ці
- **вытворныя:** паходзяць ад займеннікаў: хто, што, таму, які; прыслоўяў: дзе, калі, як, куды; часціц: быццам, нібы, жа; розных часцін мовы: затое (за + тое), нягледзячы на тое што

**2. Паводле структуры**

- **простыя:** адно слова: а, ды, бо, што
- **састаўныя:** два і больш слоў: таму што, тым часам як

**3. Паводле спосабу ўжывання**

- **адзіночныя:** ужываюцца адзін раз пры аднародных членах сказа ці частках сказа: а, але, ды (= але)
- **паўторныя:** паўтараюцца пры аднародных членах сказа ці частках сказа: або — або, і — і, ці то — ці то
- **парныя:** састаўныя, адна частка якіх ужываецца пры адным аднародным члене сказа ці частцы сказа, а другая — пры іншых: калі ..., то...; ...тады, як...



© ТДА «Аверсэв»




# Марфалагічны разбор злучніка

## Парадак разбору

1. Часціна мовы.
2. Марфалагічныя прыметы: нязменнае слова, разрад паводле паходжання, разрад паводле структуры, разрад паводле спосабу ўжывання, разрад паводле значэння.
3. Сінтаксічная роля (якія сінтаксічныя адзінкі звязвае).

## Узор разбору

Калі сонца паднялося вышэй, на зямлю зноў сышла гарачыня (І. Мележ).

*Калі* — злучнік, нязменнае слова, вытворны, просты, адзіночны, падпарадкавальны (часавы); звязвае часткі складаназалежнага сказа.



© ТДА «Аверсэв»